Мінск, 25 мая 2017 года

Ваша Экселенцыя,

Дазвольце павіншаваць Вас з 25-годдзем усталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Дзяржавай Кувейт.

Мне вельмі прыемна адзначыць, што на працягу чвэрці стагоддзя плённае і ўсебаковае супрацоўніцтва паміж нашымі дружалюбнымі краінамі паспяхова развіваецца на прынцыпах узаемнай павагі і даверу.

Спадзяюся, што ў час, калі многія рэгіёны свету ахоплены нестабільнасцю, беларуска-кувейцкі дыялог застанецца надзейным мастом паміж нашымі народамі, якія шануюць і ведаюць кошт бяспекі і спакою.

Упэўнены, што дзякуючы сумесным намаганням мы станем сведкамі далейшага ўзмацнення сувязяў у палітычнай і эканамічнай сферах, пашырэння супрацоўніцтва ў галінах інвестыцый і тэхналогій, якія могуць зрабіцца сапраўднымі лакаматывамі двухбаковых адносін.

Карыстаюся гэтай прыемнай нагодай каб пацвердзіць Вам запрашэнне наведаць Рэспубліку Беларусь з візітам, падчас якога ў нас будзе магчымасць дэталёва абмеркаваць увесь спектр беларуска-кувейцкага парадку дня.

Прыміце, Ваша Экселенцыя, шчырыя пажаданні моцнага здароўя, шчасця і поспехаў на адказнай дзяржаўнай пасадзе, а таксама запэўненне ў маёй вельмі высокай павазе.

Уладзімір Макей